Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

24 ЛІПЕНЯ 2015 г. ПЯТНІЦА № 139 (27997) Кошт 2000 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Набыць кватэру ў новабудоўлі і не трапіць у пастку**

СТАР. 4



**Дзмітрый Малікаў: як не захварэць на «зорнасць»**

СТАР. 5



**Праграма тэлебачання на наступны тыдзень**

**20 КАНАЛАЎ**

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Лілія АНАНІЧ, міністр інфармацыі:**

*«Мы ў поўным аб'ёме забяспечым правы кожнага грамадзяніна на атрыманне поўнай і дакладнай інфармацыі па ўсіх працэсах, якія будуць праходзіць у рамках выбарчай кампаніі. СМІ пастараюцца, каб выбарныя праграмы кандыдатаў на пасаду кіраўніка дзяржавы былі шырока вядомыя кожнаму выбаршчыку для прыняцця ўсвядомленага выбару. Хачу пры гэтым падкрэсліць, што інфармацыя ва ўмовах сучаснасці з'яўляецца важным сегментам, фактарам развіцця грамадства і дзяржавы. У нас назапашаны дастаткова патэнцыял інфармацыйнай прасторы, каб у поўным аб'ёме спрыяць развіццю нашай краіны».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 24.07.2015 г.

| | |
|---|---|
| Долар ЗША | 15108,00 ▼ |
| Еўра | 16615,00 ■ |
| Рас. руб. | 263,30 ▼ |
| Укр. грыўня | 683,16 ▼ |

ISSN 1990 - 763X

# ЁСЦЬ ВАРОТЫ — БУДЗЕ І ГОЛ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Летам быхаўскія падлеткі любяць бавіць час на футбольным полі.

■ Прыёмная кампанія — 2015

## З ТВОРЧЫМ УХІЛАМ

У абітурыентаў БДПУ ў лідарах — «выяўленчае мастацтва і камп'ютарная графіка»

**Аб'яўляць дадатковы набор на вакантныя бюджэтныя месцы Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт не плануе, паколькі на ўсе спецыяльнасці і дзённай, і завочнай бюджэтнай формы навучання тут склаўся конкурс. Мэтавы набор выкананы на 100 працэнтаў. А ўчора ў вядучай педагагічнай ВНУ адбылося адкрытае залічэнне на першы курс.**

Па звестках, агучаных прыёмнай камісіяй, усяго было пададзена 2583 заявы, што на 30% больш, чым у папярэднім годзе. На дзённую форму атрымання адукацыі было пададзена абітурыентамі 1553 заявы (у 2014 годзе — 1215) і 1030 заяў (у 2014 годзе — 734) — на завочную.

Ва ўніверсітэце з задавальненнем канстатуюць, што бягучая прыёмная кампанія вылучаецца высокай матываванасцю абітурыентаў: жаданне атрымліваць педагагічную адукацыю выказалі 127 медалістаў і ўладальнікаў дыпломаў з адзнакай, што амаль на трэціну больш, чым летась.

СТАР. 3




Фота Надзеі БУЖАН.



**НА «ПРАМОЙ ЛІНІІ» — МІНІСТР ПА НАДЗВЫЧАЙНЫХ СІТУАЦЫЯХ**

З дапамогай чаго удалося знізіць колькасць загінулых на пажарах да мінімуму за апошнія 15 гадоў? Як МНС плануе вырашыць праблему абмежаванага доступу да шматпавярховых дамоў з-за запаркаваных двароў? На што будзе звернута ўвага пры падрыхтоўцы да чарговага ацяпляльнага сезона?

Атрымаць адказы на гэтыя пытанні і задаць свае **міністру па надзвычайных сітуацыях Уладзіміру Аляксандравічу ВАШЧАНКУ** можна будзе **31 ліпеня** падчас «прамой лініі» ў газеце «Звязда», якая пройдзе **з 11 да 12 гадзін.** Тэлефануйце ў гэты час па нумары **(017) 287 18 71.**

Папярэдне пытанні можна пакінуць па нумары **(017) 292 38 02** ці даслаць іх на паштовую скрыню *schklennik@zviazda.by*

■ Надвор'е

## АМАЛЬ ТРОПІКІ

**На ўсходзе краіны прыпячэ да плюс 35, а потым — дажджы і навальніцы**

**Даволі няўстойлівае надвор'е на выхадныя прагназуюць сіноптыкі на тэрыторыі нашай краіны. На працягу ўсяго тыдня ў Беларусі трымалася нестабільнае надвор'е, што звязана з чаргаваннем атмасферных франтоў і абласцей павышанага ціску. У пятніцу і суботу будзе крыху спакайней, аднак у нядзелю зноў закруціць.**

СТАР. 3

# УЗНАГАРОДА БЕЗ АВАНСАЎ І ПАДТЭКСТАЎ

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ўручыў ордэн Дружбы народаў прэм'ер-міністру Азербайджана Артуру Таір аглы Расі-задэ. Высокай узнагароды дзяржаўны дзеяч удастоены за значны асабісты ўклад у развіццё і ўмацаванне гандлёва-эканамічных і гуманітарных сувязяў паміж Беларуссю і Азербайджанам.**

«Ёсць нейкі палітычны падтэкст у такіх узнагародах, ёсць і авансы, і іншае. Але што датычыцца вас, тут няма ніякіх авансаў, няма ніякіх палітычных падтэкстаў. Таму што вы столькі зрабілі для нашых адносін, колькі, мабыць, нівадзін грамадзянін Азербайджана», — сказаў беларускі лідар, звяртаючыся да Артура Таір аглы Расі-задэ.

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што ў яго склаліся дружалюбныя адносіны з кіраўніцтвам Азербайджана. «Я магу па пальцах адной рукі пералічыць такія адносіны з іншымі кіраўнікамі дзяржаў», — адзначыў Прэзідэнт Беларусі. Паводле яго слоў, значны ўклад у дасягненне такога ўзроўню ўзаемаразумення ўнёс Артур Таір аглы Расі-задэ. Прэзідэнт Беларусі выказаў перакананасць, што прэм'ер-міністр Азербайджана з удзячнасцю прыме высокую ўзнагароду і заўсёды будзе ёю ганарыцца.

У сваю чаргу, Артур Таір аглы Расі-задэ падкрэсліў, што ў Азербайджане ганарацца існуючымі з Беларуссю адносінамі. «Азербайджанскі народ заўсёды з пачуццем вялікай любові ставіўся і ставіцца да Беларусі, — сказаў ён. — Мы прыкладзём усе намаганні для таго, каб тая база, якая створана, дружалюбныя, брацкія адносіны паміж нашымі краінамі і народамі развіваліся».

Падчас сустрэчы абмяркоўваліся магчымасці стварэння новых сумесных прадпрыемстваў па вытворчасці ў Азербайджане беларускай тэхнікі, цэнтраў па яе абслугоўванню і іншыя перспектыўныя напрамкі двухбаковага супрацоўніцтва, паведамляе прэс-служба беларускага лідара.

■ Выбары-2015

# СПЕЦЫЯЛЬНЫ САЙТ ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ

**Учора пачаў сваю работу інфармацыйны рэсурс «Выбары-2015 (http://vybory2015.by), задача якога — асвятленне ўсіх найважнейшых падзей кампаніі па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

На сайце размешчана інфармацыя пра зарэгістраваныя ініцыятыўныя групы са спісам каардынатараў і членаў, навіны выбарчай кампаніі, інтэрактыўны лічыльнік дзён, якія засталіся да выбараў, і спасылка на матэрыялы, што маюць дачыненне да найважнейшай палітычнай кампаніі краіны.

## ПАДТРЫМАЦЬ ПРАВІЛЬНА

Ужо раніцай учарашняга дня на гэтым рэсурсе быў размешчаны відэазварот **старшыні Цэнтральнай камісіі Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў Лідзіі ЯРМОШЫНАЙ** да выбаршчыкаў.

Кіраўнік ЦВК назвала здзейсненыя этапы перадвыбарнай кампаніі. Першы — рэгістрацыя васьмі ініцыятыўных груп па зборы подпісаў па вылучэнні кандыдатамі ў прэзідэнты Беларусі.

«Цэнтральнай камісіі давялося правесці дастаткова складаную і карпатлівую работу, каб удакладніць, наколькі захаваны выбарчы закон пры фарміраванні ініцыятыўных груп, наколькі добраахвотна ўключаліся туды грамадзяне, ці адпавядаюць іх даныя патрабаванням нацыянальнага выбарчага заканадаўства, — гаворыць у звароце Лідзія Ярмошына. — Пасля гэтага Цэнтральная камісія прыняла рашэнне і зарэгістравала групы. Усе яны налічваюць больш за 100 грамадзян, некаторыя з іх — некалькі тысяч выбаршчыкаў, якія будуць збіраць подпісы».

Старшыня Камісіі папярэдзіла, што ў самыя бліжэйшыя дні выбаршчыкі сустрэнуцца са зборшчыкамі подпісаў. Такая сустрэча можа адбыцца падчас наведвання членамі ініцыятыўнай групы кватэр і дамоў беларусаў або ў грамадскім месцы, падчас пікета. Пры гэтым выбаршчыку неабходна праверыць наяўнасць паўнамоцтваў зборшчыка подпісаў (асабліва — падчас хатняга візіту).

Лідзія Ярмошына нагадала, што кожны выбаршчык можа паставіць свае подпісы ў падтрымку некалькіх прэтэндэнтаў, але толькі адзін раз — у падтрымку адной і той жа асобы.

## ПАЎНАМОЦТВЫ КАМІСІЙ

Другі важны этап перадвыбарнай кампаніі, які ўжо адбыўся, — утварэнне тэрытарыяльных камісій у асноўных адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінках. Утворана 153 раённыя, гарадскія, раённыя ў гарадах, абласныя і Мінская гарадская тэрытарыяльныя камісіі. «Я хацела б звярнуць вашу ўвагу, што яны будуць працаваць кожны працоўны дзень да 19 гадзін, а па суботах — з 10 гадзін да 14, — кажа ў відэазвароце старшыня ЦВК. — Таму выбаршчыкі, якія маюць пытанні, заўвагі, скаргі з нагоды работы ініцыятыўных груп, а таксама асоб, якія вылучаюцца кандыдатамі ў прэзідэнты, маюць права звяртацца ў тэрытарыяльныя камісіі ў названы працоўны час і выказваць свае прэтэнзіі, прапановы і заўвагі».

Тэрытарыяльныя выбарчыя камісіі таксама будуць кантраляваць работу ўсіх ініцыятыўных груп, правядзенне імі грамадскіх мерапрыемстваў у адпаведнасці з законам.

Акрамя таго, ЦВК рыхтуе дакументы, накіраваныя на вядзенне перадвыбарнай агітацыі ў найбольш простай і даступнай форме.

## ГРОШЫ ДЛЯ КАНДЫДАТА

Удзельнікі сёлетняй прэзідэнцкай гонкі з моманту рэгістрацыі сваіх ініцыятыўных груп могуць адкрыць уласныя выбарчыя фонды для збору ахвяраванняў фізічных і юрыдычных асоб, нагадвае Лідзія Ярмошына. «Таму, калі выбаршчык сустрэне аб'яву з рэквізітам банкаўскага рахунка той або іншай асобы, якая вылучаецца кандыдатам у прэзідэнты, ён мае права праз Беларусбанк пералічыць на гэты рахунак сродкі, — звярнула ўвагу Лідзія Ярмошына. — Пры гэтым памер добраахвотна пералічаных сродкаў ад фізічнай асобы не павінен перавышаць 20 базавых велічынь».

Лідзія Ярмошына таксама запэўніла, што пакуль скаргаў ад патэнцыйных кандыдатаў і членаў іх ініцыятыўных груп у Цэнтральную камісію не паступала. «Гэта значыць, што ўсе нормы закона, усе асноўныя правы і гарантыі, якія беларускае нацыянальнае выбарчае заканадаўства дае патэнцыйным кандыдатам у прэзідэнты, захаваныя, — падсумоўвае старшыня ЦВК. — Я пастаянна буду інфармаваць выбаршчыкаў пра кожны важны этап выбарчай кампаніі. Мы таксама будзем рады атрымліваць усе прапановы і заўвагі, накіраваныя на ўдасканаленне працэсу выбараў».

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**
*medvedeva@zviazda.by*




■ Знешняя палітыка

# НАДЗЕЯ НА СУСТРЭЧУ Ў ЧАРНІГАВЕ

**Сёння, 24 ліпеня, пасля двухгадовага перапынку Міжурадавая беларуска-ўкраінская змешаная камісія па пытаннях гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва аднаўляе сваю работу. Пасяджэнне камісіі пад кіраўніцтвам сустаршыняў — намесніка прэм'ер-міністра Беларусі Уладзіміра Сямашкі і віцэ-прэм'ер-міністра Украіны Генадзя Зубко праходзіць ва ўкраінскім Чарнігаве.**

Галоўная тэма пасяджэння — нарошчванне аб'ёмаў узаемнага гандлю. На парадку дня таксама пытанне адмены дзейных абмежаванняў (у тым ліку ўведзенага Украінай імпартнага збору), пытанне супрацоўніцтва ў сферах прамысловай і вытворчай кааперацыі, лізінгу, архітэктуры і будаўніцтва, стандартызацыі, аграпрамысловага комплексу, транспарту і аховы здароўя.

На сустрэчы таксама абмяркоўваюцца перспектывы рэалізацыі сумесных праектаў у паліўна-энергетычным сектары, машынабудаванні і фармацэўтыцы. Напярэдадні пасяджэння міжурадавай камісіі ў Чарнігаве прайшла сустрэча экспертаў двух бакоў.

«Мяркуецца, што дамоўленасці, дасягнутыя падчас пасяджэння камісіі, дазволяць у значнай ступені актывізаваць супрацоўніцтва паміж Беларуссю і Украінай па асноўных напрамках», двухбаковага парадку дня і будуць садзейнічаць павялічэнню ўзаемнага таваразвароту», — сказаў напярэдадні журналістам прэс-сакратар знешнепалітычнага ведамства Беларусі Дзмітрый Мірончык.

Міністэрства замежных спраў лічыць аднаўленне працы Міжурадавай беларуска-ўкраінскай камісіі значнай падзеяй, дадаў Дзмітрый Мірончык. Украіна з'яўляецца адным з асноўных знешнегандлёвых партнёраў Беларусі. У апошні час аб'ём беларуска-ўкраінскага гандлю неаднаразова перавышаў 6 мільярдаў долараў. У 2012 годзе ён дасягаў амаль 8 мільярдаў.

«Таму нас не можа не турбаваць скарачэнне таваразвароту ў бягучым годзе. І хоць доля беларускіх тавараў на ўкраінскім рынку застаецца адносна стабільнай — прыкладна на ўзроўні 6 працэнтаў, у абсалютных лічбах экспарт скараціўся ў студзені—маі больш як на 40 працэнтаў, — дадаў прэс-сакратар. — Варта адзначыць, што на гэтым фоне павялічыўся продаж такіх тавараў, як угнаенні, камбайны, грузавыя аўтамабілі. Але ўвогуле тэндэнцыя пакуль нас непакоіць і яна не з'яўляецца станоўчай. Больш за тое, не заўсёды скарачэнне можна тлумачыць аб'ектыўнымі прычынамі. Існуюць і штучныя перашкоды на шляху тавараабмену, такія як імпартны збор».

Беларускі бок разлічвае, што міжурадавая камісія зможа адыграць станоўчую ролю і стане адным з дзейсных інструментаў стабілізацыі і нарошчвання ўзаемнага гандлю, а таксама зняцця праблемных пытанняў. «Беларусь і Украіна — суседзі. Нам лёсам наканавана супрацоўнічаць і гандляваць», — падсумаваў дыпламат.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**
*medvedeva@zviazda.by*

**Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь глыбока смуткуе ў сувязі са смерцю былога міністра фінансаў Рэспублікі Беларусь Андрэя Міхайлавіча ХАРКАЎЦА і выказвае спачуванне яго родным і блізкім.**

**Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь глыбока смуткуюць у сувязі са смерцю былога міністра фінансаў Рэспублікі Беларусь ХАРКАЎЦА Андрэя Міхайлавіча і выказваюць шчырае спачуванне яго родным і блізкім.**

**Міністэрства фінансаў і фінансавыя органы Рэспублікі Беларусь глыбока смуткуюць у сувязі са смерцю пасля цяжкай і працяглай хваробы ХАРКАЎЦА Андрэя Міхайлавіча, які займаў пасаду міністра фінансаў Рэспублікі Беларусь з 2008 па 2014 год.**

**А.М. Харкавец унёс важкі ўклад ва ўдасканальванне фінансавай сістэмы Рэспублікі Беларусь, быў актыўным дзяржаўным дзеячам, які аддана служыў сваёй краіне.**

**Выказваем спачуванні родным і блізкім А.М. Харкаўца ў сувязі з напаткаўшым іх горам.**

**Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь смуткуе ў сувязі са смерцю былога міністра фінансаў ХАРКАЎЦА Андрэя Міхайлавіча і выказвае глыбокае спачуванне яго родным і блізкім.**

**РВУ «Выдавецкі дом «Звязда» смуткуе ў сувязі са смерцю Андрэя Міхайлавіча ХАРКАЎЦА, былога міністра фінансаў, і выказвае шчырыя спачуванні яго родным і блізкім.**


Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, офис 1703. | | | |
| **Продавец** | Мядельское районное потребительское общество, Минская область, г. Мядель, ул. 1 Мая, д. 2. | | | |
| № п/п | Инвентарный номер | Наименование | Общая площадь кв.м | Назначение |
| **ЛОТ № 1:** | | | | |
| объекты недвижимости, расположенные по адресу: **Минская обл., Мядельский р-н, кп Нарочь, ул. Лесная, д. 11** | | | | |
| 1 | 633/С-8937 | **Одноэтажное кирпичное здание гаража**, в том числе | 256,4 | Здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей (в т.ч. автомобильные заправочные и газонаполнительные станции) |
| | | кирпичная мастерская | | |
| 2 | 633/С-10948 | **Здание диспетчерской**, в том числе | 38,2 | Здание неустановленного назначения |
| | | кирпичная котельная | | |
| 3 | - | **Ограждение автогаража из ж/б плит** | 282 м.п. | |
| **Начальная цена Лота № 1 с НДС 20% — 1 440 000 000 белорусских рублей** | | | | |
| **Сведения о земельном участке:** | Для размещения автостоянок и гаражей продавцу предоставлен на праве постоянного пользования земельный участок пл. **0,5512 га.** | | | |
| **ЛОТ № 2:** | | | | |
| объекты недвижимости, расположенные по адресу: **Минская обл., Мядельский р-н, кп Нарочь, ул. Песчаная, д. 21** | | | | |
| 1 | 633/С-11171 | **Водонапорная башня** | - | Сооружение специализированное водохозяйственного назначения |
| 2 | 633/С-11169 | **Артскважина** | - | |
| **Сведения о земельном участке:** | Для обслуживания зданий и сооружений продавцу предоставлен на праве постоянного пользования земельный участок пл. **0,2783 га.** Ограничения (обременения) прав: водоохранная зона озера Нарочь (пл. 0.2783 га). | | | |
| **Начальная цена Лота № 2 с НДС 20% — 606 000 000 белорусских рублей** | | | | |
| **Задаток 10% от начальной цены лота в белорусских рублях перечисляется на р/с № 3012343260010; нерезидентами РБ задаток может перечисляться в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – 3012343265044; в российских рублях (RUB) – 3012343265028; в ЦБУ № 507 г. Минска ОАО «Белинвестбанк», БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа — ЗАО «Центр промышленной оценки».** | | | | |
| Договор купли-продажи должен быть подписан в течение **20** (двадцати) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. | | | | |
| Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также порядок оплаты вознаграждения и фактических затрат на организацию и проведение аукциона оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by. | | | | |
| **Дата и время проведения аукциона** | **03.09.2015** в 11 ч. 00 мин по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки». | | | |
| **Дата и время окончания приема документов** | **01.09.2015** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки». | | | |
| **Контактная информация:** | **Тел.: +375 17-280-36-37; +375 29-183-69-71. www.cpo.by Email: auction@cpo.by.** | | | |

# АМАЛЬ ТРОПІКІ



*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Сёння ўдзень з ростам атмасфернага ціску надвор'е палепшыцца, будзе пераважна без ападкаў. Максімальная тэмпература паветра ўдзень складзе 21-27 градусаў вышэй за нуль. У суботу тэрыторыя краіны яшчэ застанецца ў зоне павышанага атмасфернага ціску. Чакаецца па-летняму цёплае надвор'е, пераважна без ападкаў, толькі ўдзень месцамі па паўднёвым захадзе Беларусі пройдуць кароткачасовыя дажджы, магчымы навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе 8-15 градусаў цяпла, па поўдні месцамі да плюс 17, удзень будзе 23-29 цяпла, а па поўдні краіны паветра прагрэецца да плюс 30-32 градусаў.

Кардынальным чынам надвор'е зменіцца ў нядзелю, калі тэрыторыя Беларусі трапіць пад уплыў сістэмы актыўных атмасферных франтоў, якія перамяшчаюцца з паўднёвага захаду Еўропы. На большай частцы краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы, месцамі з навальніцамі, удзень у асобных раёнах навальніцы будуць суправаджацца моцным парывістым ветрам. Аднак уначы стане сапраўды камфортна, калі тэмпература паветра складзе 14-21 градусаў вышэй за нуль. А вось удзень па краіне прагназуюцца сур'ёзныя кантрасты тэмператур — у цэнтральных раёнах тэмпературны фон складзе 22-29 градусаў цяпла, па захадзе краіны будзе ўсяго плюс 19-21, а вось на ўсходзе краіны стане ўвогуле горача. **Увага! Удзень там паветра прагрэецца да плюс 30-34 градусаў, а месцамі — да плюс 35.**

Паводле доўгатэрміновых прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у панядзелак надвор'е палепшыцца, але на ўсходзе яшчэ захаваецца ўплыў атмасферных франтоў — таму там пройдуць кароткачасовыя дажджы, месцамі прагрымяць навальніцы. Уначы пры навальніцах узмоцніцца вецер парывамі да 15-20 м/с. Тэмпература паветра ўначы складзе 7-14 цяпла, удзень будзе плюс 20-26 градусаў, а па паўднёвым усходзе — 27-29 цяпла. Дажджлівым прагназуюць эксперты і аўторак. Тады ўначы месцамі, а раніцай і ўдзень на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы. Удзень у асобных раёнах магчымы моцныя дажджы, навальніцы, а пры навальніцах узмацненне ветру парывамі да 15-20 м/с. Тэмпература паветра ўначы складзе 12-19 градусаў цяпла, удзень 20-27 градусаў вышэй за нуль, па ўсходзе краіны месцамі да плюс 30 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■ Добрая навіна

## Нашы трактары «прапішуцца» і ў Белгарадзе

**Дэпартамент эканамічнага развіцця Белгародскай вобласці агучыў свае планы аб арганізацыі зборкі беларускіх трактароў у гэтым расійскім рэгіёне.**

Менавіта гэтаму пытанню быў прысвечаны візіт дэлегацыі акцыянернага таварыства «Мінскі трактарны завод» у Белгародскую вобласць, дзе запланавана стварэнне сумеснай зборачнай вытворчасці трактароў разам з кампаніяй «Металаінвест».

Паводле вынікаў праведзенай рабочай нарады ў дэпартаменце эканамічнага развіцця вобласці, падпісаны пратакол аб намерах арганізацыі зборачнай вытворчасці энерганасычаных трактароў магутнасцю ад 150 да 400 к.с. у аб'ёме больш за 100 адзінак у год. Таксама разгледжана пытанне вытворчасці навяснога абсталявання, якое агрэгатуецца з тэхнікай МТЗ, для патрэб будаўнічай і дарожна-камунальнай гаспадаркі рэгіёна.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by* ■

# З ТВОРЧЫМ УХІЛАМ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Абітурыенты, якія скончылі школу з медалём, прыязджалі падаваць дакументы з асабістымі запрашэннямі ад рэктара педагагічнага ўніверсітэта. Усяго такіх запрашэнняў для паступлення ў БДПУ без здачы ЦТ і ўступных выпрабаванняў атрымалі больш за 750 медалістаў і звыш 170 пераможцаў і прызёраў трэцяга этапу рэспубліканскай алімпіяды з г. Мінска і Мінскай вобласці.

У выдатнікаў самай вялікай папулярнасцю карыстаўся факультэт спецыяльнай адукацыі, куды падалі свае дакументы 19 медалістаў і ўладальнікаў дыпломаў з адзнакай, факультэт беларускай і рускай філалогіі (17 медалістаў і ўладальнікаў дыпломаў з адзнакай) і фізіка-матэматычны факультэт (15 медалістаў).

У конкурсе за правы быць студэнтам БДПУ ўдзельнічалі 270 выпускнікоў ліцэяў і гімназій, што на 40% больш, чым у папярэднім годзе.

На завочную бюджэтную форму навучання ў БДПУ на 370 месцаў падалі дакументы 679 абітурыентаў. Сярод іх 264 чалавекі падалі дакументы на скарочаны тэрмін навучання пры плане прыёму 150 месцаў.

На палову ўсіх спецыяльнасцяў у педагагічным універсітэце конкурс склаў 2 чалавекі і больш. Пры гэтым на шасці спецыяльнасцях конкурс быў 3 чалавекі і больш, сярод іх «Беларуская мова і літаратура. Замежная мова (англійская)», «Руская мова і літаратура. Замежная мова (англійская)», «Практычная псіхалогія»; «Сацыяльная работа», «Спартыўна-педагагічная дзейнасць (спартыўная рэжысура)» і «Музычнае мастацтва, рытміка і харэаграфія». А самы высокі конкурс на дзённую бюджэтную форму навучання быў зафіксаваны на спецыяльнасці «Выяўленчае мастацтва і камп'ютарная графіка» — 5,4 прэтэндэнта на месца.

Абітурыентка з самай высокай сумай балаў (361!) — выпускніца Баранавіцкага ліцэя — падала свае дакументы на спецыяльнасць «Фізіка. Інфарматыка».

На завочнай бюджэтнай форме навучання самы высокі конкурс склаўся на спецыяльнасці «Пачатковая адукацыя» (6 чалавек на месца) і «Музычнае мастацтва, рытміка і харэаграфія» (5 чалавек).

**Стаць студэнткай дзённай бюджэтнай формы навучання не змагла абітурыентка з сумай балаў 324, якая планавала вывучаць у педуніверсітэце рускую мову і літаратуру. На гэтую спецыяльнасць было выдзелена ўсяго 15 бюджэтных месцаў.**




Фота Надзеі БУЖАН.

А самы высокі прахадны бал ва ўніверсітэце (305) склаўся на спецыяльнасці «Выяўленчае мастацтва і камп'ютарная графіка».

Разам з тым, як высветлілася на адкрытым залічэнні, стаць студэнткай дзённай бюджэтнай формы навучання не змагла абітурыентка з сумай балаў 324! Дзяўчына планавала вывучаць у педуніверсітэце рускую мову і літаратуру. На гэту спецыяльнасць было выдзелена ўсяго 15 бюджэтных месцаў. І менавіта сюды падалі свае дакументы 10 медалістаў, якія маюць права на залічэнне ўвогуле без здачы экзаменаў, і 6 чалавек з мэтавымі накіраваннямі ад аддзелаў адукацыі. Такім чынам, бюджэтных месцаў на звычайны конкурс увогуле не засталося. Абітурыентка, якая набрала 324 балы, на бюджэт не прайшла і аказалася першай у спісе тых, хто застаўся за бортам. Рэктар універсітэта Аляксандр Жук прапанаваў дзяўчыне паступаць на платную форму атрымання адукацыі і паабяцаў, што тая будзе атрымліваць рэктарскую стыпендыю. Пры выдатнай вучобе студэнты-платнікі могуць прэтэндаваць на істотныя зніжкі з кошту навучання, і нават, калі вызваліцца бюджэтнае месца, маюць шанцы перавесціся на бюджэт. Вось такая атрымалася лыжка мёду з горкім прысмакам.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

■ Не хлебам адзіным

## РАЗУМЕЦЬ ДУХОЎНЫ СКЛАДНІК

**Чацвёрты дзень міжнароднага маладзёжнага прафсаюзнага адукацыйнага форуму «ТЭМП» праходзіў пад знакам рэлігіі і веры. Маладых людзей чакала экскурсія па храме-помніку ў гонар Усіх святых у Мінску, а таксама размова з яе клірам. Гутарка праходзіла ў фармаце «пытанне — адказ». Дзеячы прафсаюза з Беларусі, Расіі, Азербайджана, Казахстана, Кыргызстана, Малдовы, Таджыкістана і Кіпра цікавіліся, як Беларуская Праваслаўная Царква супрацоўнічае з моладдзю, ці падтрымлівае яна дыялог з іншымі канфесіямі і як спалучаюцца ў сучасным свеце вера і патрыятызм.**

«Арганізатары самі звярнуліся да нас, а нам засталося толькі прыняць гасцей», — прызнаецца протаіерэй Сергій Яўтушак, клірык храма ў гонар Усіх святых, які якраз і гутарыў з прадстаўнікамі прафсаюзных аб'яднанняў. Адзін з арганізатараў форуму, Арцём Ігнаценка, старшыня Маладзёжнага савета Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі, лічыць, што без такога дня абысціся немагчыма: «Мы хочам паказаць маладым людзям, што трэба не толькі пастаянна праводзіць трэнінгі на камандаўтварэнне, на дзелавы стыль і этыкет. Але трэба бачыць і разумець і ўнутраны духоўны складнік чалавека».

Дарэчы, сярод удзельнікаў былі тыя, што прытрымліваюцца неправаслаўнага веравызнання. Напрыклад, Дар'я Хаміджанава, прафсаюзны дзеяч з Караганды, — мусульманка, але камфортна сябе адчула падчас духоўнай экскурсіі: «У нас у Казахстане шмат нацыянальнасцяў і такі ж талерантны народ, як і ў Беларусі. Я вельмі рада, што ўпершыню ў жыцці пабывала ў праваслаўным храме і мне спадабалася. Бо, як ні глядзі, Бог адзіны, і агульначалавечыя каштоўнасці ў ісламе і праваславі амаль аднолькавыя».

А для праваслаўных удзельнікаў, у тым ліку і з нашай краіны, экскурсія стала нагодай наведаць храм. «Нягледзячы на тое, што я праваслаўны, нячаста даводзіцца бываць у царкве, — кажа Дзмітрый Ціхановіч, які працуе ў галоўным упраўленні міжнароднага супрацоўніцтва ФПБ. — Не тое каб ад недахопу рэлігійнасці, але хутчэй часу. Нам не менш добра, што мы прыехалі сюды. Бо храм — прамая дарога да Бога, пра якую нельга забываць. Я лічу, што галоўнае — насіць яго вобраз у сабе, жыць прыстойна, па правілах, быць добразычлівымі людзьмі».

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by* ■

# ІРЛАНДЦЫ БАТЭ НЕ ПЕРАШКОДА

**Чэмпіёны Беларусі па футболе ўнічыю згулялі ў гасцях з ірландскім «Дандолкам» і выйшлі ў трэці кваліфікацыйны раунд Лігі чэмпіёнаў.**

Эмоцыі захлiствалі яшчэ да стартавага свістка. Падчас гульні ў Барысаве форвард БАТЭ бадануў аднаго з сапернікаў. Хлопцы з вострава гэта без увагі не пакінулі. І калі перамагчы на футбольным полі беларусаў у іх не атрымалася (вікторыю з лікам 2:1 святкавалі нашы суайчыннікі), вырашылі пайсці кабінетным шляхам, — напісалі ліст у УЕФА аб дыскваліфікацыі Радзівонава на матч у адказ. Але футбольныя чыноўнікі вырашылі не пакідаць Віталя без гульні, што выклікала ў Ірландыі абурэнне. «Фанаты «Дандолка» арганізуюць Радзівонаву гарачы прыём!» — казалі адны. «Наша перамога стане яшчэ больш салодкай, калі яны будуць у поўным складзе», — чулася ад іншых. Але ўсе падобныя заявы, як здалося, прайшлі міма беларускай каманды. На полі барысаўчане дзейнічалі карэктна, на правакацыі не адказвалі.

Паўторны матч атрымаўся вельмі складаным. Запоўненыя трыбуны «Арыэл Парка» гналі сваіх наперад, але БАТЭ быў проста мацней. Жадання ў «Дандолка» шмат, але на ім адным далёка не праедзеш. Барысаўчане паўсталі больш разнастайнай, цікавай камандай. І хоць не забілі, атакавалі вастрэй за саперніка. Але і варатару Сяргею Чэрніку таксама прыйшлося папрацаваць. У адным эпізодзе ён пацягнуў мяч, які мог стаць пераломным у супрацьстаянні, калі б трапіў у вароты. БАТЭ рушыць далей.

— Мы павінны прызнаць, што сапернік быў лепшы за нас, — сказаў пасля сустрэчы расчараваны Стывен Кені, галоўны трэнер «Дандолка». — У нас наогул нічога не атрымалася. БАТЭ заслужана прайшоў далей.

У наступным раўндзе барысаўчане згуляюць з «Відэатонам», чэмпіёнам Венгрыі. У свой час гэты клуб, заснаваны ў 1941-м годзе, удзельнічаў нават у фінале Кубка УЕФА. «Відэатон» двойчы становіўся чэмпіёнам сваёй краіны. На яго рахунку адна перамога ў розыгрышы Кубка Венгрыі.

**Тарас ШЧЫРЫ.** *taras@zviazda.by*

**Як гулялі астатнія? Вынікі паўторных матчаў 2-га кваліфікацыйнага раўнда Лігі чэмпіёнаў.** «Дзіла» (Грузія) — **«Партызан» (Сербія)** — 0:2 (першы матч — 0:1), «Пюнік» (Арменія) — **«Мёльдэ» (Нарвегія)** — 1:0 (0:5), **«Мілсамі» (Малдова)** — «Лудагарац» (Балгарыя) — 2:1 (1:0), **ХІК (Фінляндыя)** — «Вентспілс» (Латвія) — 1:0 (3:1), **«Макабі» (Ізраіль)** — «Хіберніанс» (Мальта) — 5:1 (1:2), «Вардар» (Македонія) — **АПАЭЛ (Кіпр)** — 1:1 (0:0), «Лінкальн» (Гібралтар) — **«Мідт'юланд» (Данія)** — 0:2 (0:1), «Жальгірыс» (Літва) — **«Мальмё» (Швецыя)** — 0:1, «Кruзэйдэрс» (Паўночная Ірландыя) — **«Шкендэрбеу» (Албанія)** — 3:2 (1:4), **«Астана» (Казахстан)** — «Марыбор» (Славенія) — 3:1 (0:1), «Фола» (Люксембург) — **«Дынама» (Харватыя)** — 0:3 (1:1), **«Сцяўа» (Румынія)** — «Трэнчын» (Славакія) — 2:3 (2:0), **«Відэатон» (Венгрыя)** — «Н'ю Сэйнтс» (Уэльс) — 1:1 (1:0). «Рудар» (Чарнагорыя) — **«Карабах» (Азербайджан)** — 0:1 (0:0), **«Лех» (Польшча)** — «Сараева» (Боснія і Герцагавіна) — 1:0 (2:0), «Ст'ярнан» (Ісландыя) — **«Сэлцік» (Шатландыя)** — 1:4 (0:2).

■ Сталіца

## ДАЎГАБУДАМІ ЗАЙМАЦЦА НЕ ВЫГАДНА

### Сума штрафаў такіх гора-забудоўшчыкаў складае каля 19 млрд рублёў

**У апошнюю дэкаду ліпеня ў Мінску будзе ўведзена ў эксплуатацыю 6 з 14 дамоў са звышнарматыўнымі тэрмінамі будаўніцтва, паведаміў на пасяджэнні Мінгарвыканкама намеснік старшыні гарвыканкама Віктар ЛАПЦЕЎ.**

Асобна ён адзначыў, што цяпер у сталіцы даўгабудаў практычна не існуе, бо зрыў тэрмінаў будаўніцтва складае літаральна адзін-два месяцы. Напрыклад, гэтыя шэсць дамоў павінны былі завяршыць у чэрвені. В. Лапцеў паведаміў, што, каб пазбегнуць з'яўлення ў горадзе новых дамоў са звышнарматыўнымі тэрмінамі будаўніцтва, недобрасумленныя забудоўшчыкі прыцягваюцца да адміністрацыйнай адказнасці. Таксама прымаюцца захады па канфіскацыі зямельных участкаў, засваенне якіх заказчык не распачаў. З парушальнікамі горад змагаецца і праз сістэму штрафаў. Толькі летась і за першую палову 2015 года ў бюджэт паступіла каля 19 млрд рублёў штрафаў, якія выплацілі недобрасумленныя забудоўшчыкі.

Паводле інфармацыі спецыяліста, арганізацыямі ўсіх формаў уласнасці ў студзені-чэрвені ў сталіцы ўведзена ў эксплуатацыю 554,3 тысячы квадратных метраў жылля. Для гараджан, якія стаяць на ўліку для паляпшэння жыллёвых умоў, уведзена 173,7 тысячы квадратных метраў, або 31,3% ад агульнага аб'ёму жылля.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by* ■

■ Купляем разам

# ЗАБУДОЎШЧЫК «У РАЗРЭЗЕ»

## Прафесіянал будаўнічай сферы расказвае пра тыповыя памылкі пакупнікоў кватэр у новабудоўлях

**Пасля публікацыі парад аб выбары жылых памяшканняў на другасным рынку нерухомасці мы атрымалі адразу некалькі прапаноў для працягу гэтай тэмы. У прыватнасці, адзін чытач папрасіў раскрыць нюансы, якія сустракаюцца ў камерцыйным будаўніцтве жылля. Заданне сур'ёзнае, але нам пашанцавала — днямі дырэктар спецыялізаванай рыэлтарскай арганізацыі, якая аказвае паслугі на рынку долевага будаўніцтва жылля, Юрый ЖАРКОЎ правёў майстар-клас для пакупнікоў падобнага жылля на прыкладзе канкрэтных жылых комплексаў і падманутых чаканняў іх цяперашніх жыхароў. З дапамогай партала Realt.by мы паспрабавалі скласці спіс самых актуальных рэкамендацый.**


На эскізах жылыя комплексы заўсёды выглядаюць цудоўна.

### УПЭЎНЕНАСЦЬ МАЕ СВОЙ КОШТ

Адразу спікер адзначыў, што, паколькі рынак яшчэ малады, многія яго прафесійныя ўдзельнікі кіруюцца прынцыпам «Падмані блізкага свайго», таму першым правілам для кліентаў стане адказнае стаўленне да выбару забудоўшчыка.

— У сярэдзіне нулявых гадоў парог уваходжання на будаўнічы рынак быў вельмі нізкі, — разважае Юрый Жаркоў. — Забудоўшчыкамі станавіліся людзі, якія яшчэ ўчора, умоўна кажучы, гандлявалі на Ждановічах. Паколькі рызыкі фінансавай нестабільнасці ў той час яшчэ не існавала, дольшчыкі ахвотна ўкладвалі грошы ў будаўніцтва і не задумваліся аб магчымых наступствах.

Сёння большасць найбуйнейшых забудоўшчыкаў уваходзяць у адпаведную Асацыяцыю. Гэтыя арганізацыі будуюць, як правіла, дорага, але надзейна, паколькі працуюць на пазыковых грошах, а не на долевых узносах. У гэтым выпадку іх будоўля не спыніцца, калі на рынку здарыцца крызіс і дольшчыкі перастануць яе аплочваць. Кватэра ад сумніўнага забудоўшчыка будзе каштаваць танней, але ўзровень рызыкі пры яе будаўніцтве значна вышэйшы.

### РЭАЛЬНА АЦЭНЬВАЦЬ СТАТУС МІКРАРАЁНА

Пры планаванні будаўніцтва кватэры трэба ўлічваць якасць жылога асяроддзя мікрараёна, у якім яна будуецца, і яе далейшую інвестыцыйную прывабнасць. Некаторыя сегменты жыллёвага рынку маюць заведама нізкую інвестыцыйную прывабнасць. Да такога сегменту адносіцца жыллё камфорт-класа — кватэры ў каркасна-блочных дамах, якія фарміруюць сярэднюю цану на рынку. Яны часта будуюцца ў спальных мікрараёнах і пры гэтым прэтэндуюць на павышаны клас якасці. Але пасля такія дамы хутчэй за ўсё апынуцца па-за зонай жывога рынку.

У якасці прыкладу спадар Жаркоў прывёў жылы дом палепшанай камфортнасці ў Каменнай Горцы. А гэта мікрараён пераважна панэльнай забудовы, дзе наша «камфортпабудова» будзе адным з нешматлікіх каркасна-блочных дамоў, размешчаных у ім. Каркасна-блочны дом будуецца ўдвая даўжэй за панэльны. За час яго будаўніцтва рынак, як правіла, паспявае памяняцца некалькі разоў, а калі будаўніцтва прыпадае на крызіс, дом дабудуюць у рэжыме жорсткай эканоміі, якая непазбежна адаб'ецца на якасці жылля.

За кватэры ў «камфорце» дольшчыкі заплацілі больш, чым тыя, хто купіў кватэру ў суседнім панэльным доме. Аднак, паводле слоў эксперта, і элітны дом, і «панэлька» знаходзіцца ў спальным раёне з нізкай якасцю жылога асяроддзя. Таму прадаць гэтую кватэру на другасным рынку можна ў абодвух дамах прыкладна па аднолькавым кошце.

Так, аднапакаёвая кватэра ў «камфорце» мае плошчу каля 50 квадратных метраў, у суседнім доме — 40-45 «квадратаў». Чалавек, які купляе кватэру ў раёне панэльнай забудовы, яўна настроены сэканоміць і не мае патрэбы ў нейкіх дадатковых лішніх бонусах, бо за іх яму прыйдзецца даплаціць жывыя грошы. І для таго, каб канкурыраваць па цане з «панэлькай», наадварот, прадаўцу давядзецца зрабіць добрую зніжку — 10-15%. У выніку квадратны метр у каркасна-блочным выкананні акажацца нават таннейшым, чым у панэльным доме па суседстве, хоць дольшчыкі адразу плацілі за яго больш.

Наступным высокарызыкоўным сегментам рынку, паводле слоў дырэктара кампаніі, з'яўляюцца катэджныя пасёлкі камфорт-класа. Гэта доўгія і цяжкія праекты, якія карыстаюцца вельмі нізкім попытам на другасным рынку. Сеткі і камунікацыі для будаўніцтва добраўпарадкаванага катэджнага пасёлка ў прыгарадзе абыдуцца забудоўшчыку ў каласальную суму ў пераліку на квадратны метр вашага жылля. Цяпер на рынку ёсць некалькі катэджных пасёлкаў, якія знаходзяцца на мяжы банкруцтва. Таму, калі кліент хоча жыць за горадам, яму лепш купіць гатовы дом або пабудаваць яго самастойна, але не ўвязвацца ў долевае будаўніцтва катэджных пасёлкаў.

### БЕЗ ЧУЖЫХ ВОКНАЎ НАСУПРАЦЬ

Пры набыцці кватэры ў новым доме неабходна дасканала вывучыць дэталёвы план развіцця тэрыторыі, на якой ён знаходзіцца, каб не аказацца жыхаром кватэры, вокны якой выходзяць на паркінг. Калі паркінга няма на эскізах забудоўшчыка, гэта не значыць, што яго няма і ў праекце дэталёвай планіроўкі раёна.

У якасці прыкладу падманутых чаканняў дольшчыкаў Юрый Жаркоў прывёў жылы комплекс прыватнага забудоўшчыка «N» у сталіцы. На рэкламным эскізе для кліентаў жылы комплекс «N» меў даволі прывабны выгляд: тут павінен быў узнікнуць аб'ект сацыяльна-бытавой інфраструктуры (басейн або дзіцячы садок). Пад вокнамі адной з жылых секцый планавалася двухпавярховая пабудова невядомага прызначэння. Таму людзі, якія набылі кватэру на верхніх паверхах гэтай секцыі, заплацілі дадатковыя грошы за прыгожы від з акна.

Аднак у канчатковым варыянце «N» быў уведзены ў эксплуатацыю з пэўнымі зменамі. Двухпавярховая пабудова ператварылася ў шматкватэрную вежу. Замест віду на вадаём і зялёны скверык жыхары секцыі насупраць атрымалі від у чужыя вокны. Перад вокнамі крайняй секцыі з'явіўся не сацыяльна-бытавы аб'ект, а яшчэ адзін жылы дом. І бяда не ў тым, што жыхары засталіся без басейна, а ў тым, што замест басейна яны набылі сотню суседзяў, лішні трафік і двары, што застаўлены машынамі. А кліенты цяпер не змогуць засудзіць забудоўшчыка за такія метамарфозы. Таму што ў дагаворы, які быў заключаны, не была асобна прапісана адказнасць за від з акна.

### ЗУСІМ ТАННА ПРОСТА ТАК НЕ БЫВАЕ

А яшчэ Юрый Жаркоў катэгарычна рэкамендуе не ўвязвацца ў сумніўныя фінансавыя схемы і не аплачваць будаўніцтва наяўнымі грашыма. Нагадаю, што менавіта на гэтым пагарэлі дольшчыкі дома па вуліцы Прытыцкага, які ўзводзіўся забудоўшчыкам «Тэрабудінвест».

Толькі кантрольныя органы потым высвятлілі, што ў гэтага забудоўшчыка было ажно два офісы продажаў, два дырэктары і дзве пячаткі юрыдычнай асобы. У адным з офісаў дольшчыкам прапаноўвалася купіць кватэры з камбінаванай аплатай: заплаціць за кожны метр 600 долараў, што прапісана ў дагаворы (гэта сабекошт будаўніцтва), і 300 долараў аддаць арганізатарам гатоўкай. У іншым офісе квадратны метр прадаваўся за 1,5 тысячы долараў. Знайшлося нямала людзей, якія вырашылі сэканоміць. Але паколькі кватэры рэалізоўваліся праз два офісы, кожны з якіх меў пячатку юрыдычнай асобы, адны і тыя ж жылыя памяшканні часта рэалізоўваліся паўторна. Гэтая гісторыя ў свой час прагрымела на ўсю краіну, аднак вера ў асобных людзей у дармаўшчыну невынішчальная, таму і цяпер спажыўцы працягваюць увязвацца ў падобныя сумніўныя схемы.

### ПРАДУГЛЕДЗЕЦЬ МАГЧЫМЫ СПАД

Наш спецыяліст параіў па магчымасці разбірацца ў макраэканоміцы краіны. Ва ўсім разбірацца, можа, і не трэба, а вось мець пэўны «нюх» на сур'ёзныя складанасці не перашкодзіць.

Дольшчыкі кааператыва «Самацветы», якія будаваліся на скрыжаванні вуліц Адоеўскага і Бельскага, гэтае правіла праігнаравалі. Будаўніцтва гэтага ЖК трапіла на фінансавы крызіс 2011 года. Рублёвыя ўзносы дольшчыкаў, якія ўклалі грошы на парозе крызісу, трохразова абясцэніліся. Дабудаваць дом па тых цэнах, якія былі закладзены ў дагаворы долевага будаўніцтва, забудоўшчык ужо не мог. Каб прыцягнуць новых дольшчыкаў у перыяд крызісу, яму давялося сур'ёзна знізіць цэны і прадаваць кватэры сабе ва ўрон.

Кампанія спрабавала выратаваць ад крызісу рублёвыя ўклады дольшчыкаў: выводзіла іх з будаўніцтва і купляла на іх залатыя зліткі, аблігацыі, аўтамабілі і нерухомую маёмасць. У справу ўмяшаўся Дзяржкантроль і прымусіў забудоўшчыка вярнуць гэтыя грошы ў будоўлю. Грошы вярнулі і дом дабудавалі, але якім коштам... Пасля каласальных клопатаў людзі ўсё ж атрымалі свае кватэры, але на 3 гады пазней, чым меркавалі, а ўбудаваная камерцыйная частка будынка і да гэтага часу не ўведзена ў эксплуатацыю.

### КАБ КРЭДЫТ НЕ СТАЎ ПАСТКАЙ

Спікер нашага майстар-класа раіць усім кліентам, перш чым узяць крэдыт, рэальна разлічваць свае сілы.

Крэдытныя грошы цяпер сапраўды дарагія. Плаціць 30-40% на працягу 20 гадоў — нонсэнс. За гэты час рынак упадзе і падымецца некалькі разоў, а кліент будзе аддаваць пазыкі крэдыторам. Перад дэвальвацыяй 2008-га знаёмы эксперта ўзяў валютны крэдыт пад 15% за год і на піку рынку, калі квадратны метр каштаваў 1900 долараў, купіў 46-метровую кватэру ў панэльным доме 1970 года пабудовы. У выніку двух крызісаў кошт квадратнага метра ў яго кватэры ўпаў да 1200 долараў, а рублёвая зарплата, якую ён атрымліваў на дзяржпрадпрыемстве, значна абясцэнілася ў замежнай валюце. Каб хоць неяк абслугоўваць гэты крэдыт, гора-пакупніку давялося 5 гадоў здаваць кватэру ў арэнду. А грошай, якія ён увесь гэты час аддаваў на пагашэнне крэдыту, хапіла б на 130-метровую кватэру ў элітным доме «Ля Траецкага».

**Сяргей КУРКАЧ.**
*kurkach@zviazda.by*

«Банк, основанный на доверии»
Трастбанк ЗАО «Трастбанк»
220035, г. Минск, ул. Игнатенко, 11

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 июля 2015 г.

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.07.2015 | 01.07.2014 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 44 767 | 25 216 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | 388 | 364 |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 249 386 | 195 641 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 184 212 | 30 319 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | - | - |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 393 330 | 323 288 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | - | - |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | 4 595 | 2 364 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 157 579 | 159 130 |
| 11 | Имущество, предназначенное для продажи | 1110 | 44 180 | 4 108 |
| 12 | Отложенные налоговые активы | 1111 | - | - |
| 13 | Прочие активы | 1112 | 69 388 | 51 856 |
| 14 | ИТОГО активы | 11 | 1 147 825 | 792 286 |
| 15 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| 16 | Средства Национального банка | 1201 | 47 855 | 47 265 |
| 17 | Средства банков | 1202 | 86 060 | 19 770 |
| 18 | Средства клиентов | 1203 | 614 244 | 461 687 |
| 19 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1204 | 45 192 | 38 770 |
| 20 | Производные финансовые обязательства | 1205 | - | - |
| 21 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | - | - |
| 22 | Прочие обязательства | 1207 | 91 514 | 10 980 |
Сваім прыкладам Іванавіч натхняе тых, хто трапіле да яго. Напэўна, таму ў прытулак заўсёды прыходзяць людзі; а тыя, каму калісьці дапамог, часта вяртаюцца, каб аддзячыць. Юрыя Мельніка можна назваць чалавекам, які знайшоў свой сэнс у гэтым свеце, які, зрэшты, даступны для кожнага, толькі прайсці духоўны шлях да яго могуць не ўсе. Аднак на развітанне гаспадар прызнаецца, што ёсць у яго і цалкам зямная мэта: стварыць у Мінску круглагадачны дом для абяздоленых. Калі нехта жадае дапамагчы ў яе дасягненні — хаця б проста перадаць нейкія рэчы ці прадукты, — кантакты Юрыя Іванавіча можна даведацца ў нашай рэдакцыі.

**Дзіяна СЕРАДЗЮК.** *seradzyuk@zviazda.by*


Фота Аляксандра ШАБЛЮКА.
У прытулку ёсць зона адпачынку пад адкрытым небам.

■ Неасабісты суб'ектыў



# ЦІ БЫЛІ ВЫ Ў ШВЕЙЦАРЫІ?

## Пра параўнанне, у якім усё спазнаецца, і пра тое, як заяц у ваўка ператварыўся

«ЗОРКА» французскага і сусветнага кіно Жэрар Дэпардзьё, які цікавіцца сельскай гаспадаркай, паехаў з нашай краіны прыемна ўражаны. Не толькі ўмовамі працы на фермах, нашай слаўтай гасціннасцю і прыгажосцю жанчын, але і парадкам на зямлі. Атрымаць ад чалавека, які без перабольшвання аб'ездзіў увесь свет, параўнанне з маленькай Швейцарыяй — дарагога варта. І нагода для гонару яшчэ тая, што вядомы француз не першы, хто гэты парадак заўважае.

У прынцыпе, нічога дзіўнага ў тым няма, бо добраўпарадкаванне і ашчадныя адносіны да таго, што маем, — адзін з прыярытэтаў дзяржаўнай палітыкі. Год навядзення парадку на зямлі ў свой час падштурхнуў да маштабнай працы на ўсіх узроўнях, і ўжо стала прывычным, што вуліцы ў нас чыстыя, палі — дагледжаныя, узбочыны вакол дарог абкошаныя, нават у невялікіх вёсках стаяць і пастаянна вывозяцца кантэйнеры для смецця. І калі яшчэ гадоў сямнаццаць назад заставалася толькі з прыкрасцю ўздыхаць, угледжваючы з чысценькай (як тады здавалася) Літвы ў прыгожую пейзажамі, але «непрычасаную» Беларусь, дык цяпер усё з дакладнасцю наадварот. Бо, вядома, пра што кажу, таму што мінулым летам давялося праехаць з Каўнаса ў Вільнюс у звычайнай электрычцы (прыкладна як ад Стоўбцаў да Мінска). Паўразбураныя будынкі колішніх паўстанкаў, закінутыя хутары з праваленымі дахамі, трава ўздоўж чыгункі ў чалавечы рост і малады хмызняк, у якім давялося пабачыць нават казулю. Пасля гэтага Беларусь здалася вельмі падобнай да Бельгіі, якую таксама з поўдня на поўнач праехала ў прыгарадных цягніках: такія ж раўнюткія апрацаваныя палі, акуратныя будынкі, толькі што каровы на палях іншай масці ды ў нашых на шыях званочкаў няма...

КАРАЦЕЙ, падстава для гонару сапраўды ёсць. Увогуле, да добрага прывыкаеш хутка, таму і гэтае пачуццё стала для нас справай звычайнай. Толькі тут вось якое пытанне ўзнікае, калі задумацца. Ганарыцца сваёй чыстай, прыгожай, сапраўды еўрапейскай краінай мы можам і маем на тое тысячу і адну прычыну. А вось ці можам мы ганарыцца ў гэтым плане самі сабой? Ці жылі б мы ў такой чысціні і прыгажосці, калі б не згаданая ўжо палітыка дзяржавы, калі б не вялізныя сродкі, якія на гэта выдаткоўваюцца, калі б не тысячы людзей, для якіх падтрымліваць гэты парадак — штодзённая праца і непасрэдны службовы абавязак? Калі кожны, у выключна індывідуальным парадку, задасць сам сабе гэта пытанне, наўрад ці адказ будзе станоўчым.

Бо на чыстых вуліцах, па якіх па два разы на дзень праходзяць дворнікі (таму яны і чыстыя), усё роўна недакуркі і паперкі кідаем проста пад ногі. Бо на беразе ляснога возера пасля адпачынку пакідаем кучы смецця (прыйдзе егер ці ляснік і ўсё зборэ). Бо да зямлі, якую нахапалі ва ўласнасць, ставімся без павагі, і яна зарастае бур'янам і нават маладзенькім хмызняком, пакуль сельсавет ці ўчастковы настрашаць буйным штрафам ці тым, што ўчастак увогуле забяруць.

У НАС у вёсцы такі ўчастак прама пад вокнамі. Сусед, дзядзька Анатоль, жыў адзін, дзяцей пасля сябе не пакінуў, і таму пасля яго смерці далёкія сваякі хату хуценька прадалі пад дачу. Сядзіба ў дзядзькі была па абодва бакі вясковай вуліцы, але на адным не засталося ніякіх пабудоў, таму ўчастак з хатай дастаўся адным гаспадарам, а той, які на нашай палове, пайшоў на продаж з аўкцыёну іншым. Пасля яго некалькі разоў перапрадавалі, але гаспадарыць на ім ніхто з уласнікаў так і не пачаў — хіба што парачкі з кустоў паабіралі. Вядома ж, участак зарос дзідамі бур'яну, а ля рэчкі дык і ўвогуле шуміць сапраўдны бярозавы гай. Сусед калісьці гэтыя прысады дагледаў, бо меў адтуль увесну шмат свайго бярозавіку, а цяпер там цэлы лес. Я ўсё збіраюся пайсці паглядзець там грыбоў, бо ўмовы самыя спрыяльныя.

Не ведаю, як грыбы, але зайцы там завяліся дакладна. Сапраўдныя, русакі. Зусім не палоханыя. Адзін уранку прыходзіў да нас на ганак, пасля паскакаў на агарод. Вялізны такі, з доўгімі вушамі. Давялося стукаць у акно і крычаць «акыш!» (першае, што прыйшло на розум, бо няма ў вясковым лексіконе такога слова — зайцоў ганяць). Збіраліся ўжо ў сельсавет тэлефанаваць, каб шукалі ў Мінску тых гаспадароў, што так участак запусцілі, але ж яны ў выхадныя самі прыехалі — парэчкі саспелі. Лабузу таксама касіць давялося, бо да кустоў не прыступіцца. Вось тут мы і пацешыліся.

Прыйшоў адзін з касцой да нас у калодзеж вады набраць, а мама так ласкава яму і кажа: «Што ж ты, чалавеча, так участак запусціў?» — «Ат, хай зарастае, вось каля кустоў абкосім, а далей — навошта?» — «А ці ведаеш ты, што на ім ваўкі завяліся?» Мужык так і застыў з конаўкай у руках: «Якія ваўкі?» «Звычайныя, шэрыя. Жывуць у вашым бярэзніку. Нядаўна пад хату прыходзіў адзін»... Той аж рот ад здзіўлення разінуў, а маці, бачачы, што метамарфоза з зайца ў ваўка ўдалася і ўсё на веру ўспрымаецца, спагадліва дадала: «Глядзі, сынок, зараз як пачнуць на людзей паляваць, ты адным штрафам не абыдзешся»...

Трэба было бачыць, як яны той участак касілі. Увесь, не толькі ля кустоў. Раз-пораз азіраючыся на бярэзнік — пэўна, баяліся, што воўк адтуль выскачыць.

СТВАРАЛІ на сваёй зямлі парадак. Уласнымі рукамі рабілі сабе мікра-Швейцарыю. Можа, дасць Бог, і прывыкнуць, і будуць рабіць. Да добрага ж хутка прывыкаеш.

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.** *alena@zviazda.by*

# УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ»

## 24 августа 2015 г. проводит открытый аукцион № 14-А-15
## на право заключения договоров аренды земельных участков в г. Минске

Минский городской центр недвижимости

**Вид аукциона:** открытый (на повышение начальной цены). Предмет аукциона: право заключения договора аренды земельного участка. Аукцион проводится в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462. На торги выставляется право аренды 4 земельных участков для строительства объектов недвижимости в г. Минске: сроком на 5 лет.

| № предмета аукциона | Месторасположение земельного участка | Кадастровый номер земельного участка | Площадь, га | Целевое назначение земельного участка/ назначение земельного участка в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества | Начальная цена предмета аукциона (бел. руб.) | Сумма задатка (бел. руб.) | Расходы на подготовку документации для проведения аукциона (бел. руб.) | Отдельные условия, предусмотренные в решении Мингорисполкома об изъятии земельного участка для проведения аукциона и иные условия аукциона |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| 1 | г. Минск ул. Стебенёва | 500000000004005402 | 0,3086 | для строительства объекта «Станция технического обслуживания по ул.Стебенёва» / земельный участок для размещения объектов по ремонту и обслуживанию автомобилей (в том числе автомобильных заправочных и газонаполнительных станций) | 465 430 548 | 70 000 000 | 27 340 491 | Проектирование объекта осуществлять со следующими параметрами: общая площадь здания 432 кв.м, функциональное назначение объекта – станция сервисного обслуживания автомобилей, магазин товаров для автомобилей, пункт сбора отработанных АКБ, состав объекта – здание СТО с тремя постами обслуживания и магазином, очистные сооружения дождевого стока |
| 2 | г. Минск в районе ул. Брикета — МКАД (34 км) | 500000000006007843 | 3,5480 | для строительства объекта «Административно-деловой комплекс» в районе ул.Брикета-МКАД (34 км)/ земельный участок для размещения объектов административного назначения | 11 413 121 016 | 1 712 000 000 | 64 129 665 | Проектирование и строительство объекта осуществлять со следующими параметрами: общая площадь здания комплекса (подлежит уточнению проектом): 38 400 кв.м, в том числе паркинга – 12 000 кв.м, функциональное назначение объекта — административно-делового назначения, состав объекта — административно-деловой комплекс со встроенным паркингом |
| 3 | г. Минск на пересечении МКАД — ул. Шаранговича | 500000000006007841 | 0,5133 | для строительства объекта «Автоматизированная АЗС на пересечении МКАД — ул.Шаранговича» / земельный участок для размещения объектов по ремонту и обслуживанию автомобилей (в том числе автомобильных заправочных и газонаполнительных станций) | 1 475 027 004 | 221 000 000 | 59 699 269 | Проектирование и строительство объекта осуществлять со следующими параметрами: функциональное назначение объекта – коммунальный объект, состав объекта — автоматизированная автозаправочная станция (ААЗС) на одну ТРК |
| 4 | г. Минск в развязке МКАД — Брестское шоссе на въезде в г. Минск | 500000000005007159 | 0,6000 | для строительства станции технического обслуживания (СТО) в развязке МКАД — Брестское шоссе на въезде в г.Минск / земельный участок для размещения объектов по ремонту и обслуживанию автомобилей (в том числе автомобильных заправочных и газонаполнительных станций) | 801 286 068 | 120 000 000 | 34 384 994 | Проектирование объекта осуществлять со следующими параметрами: общая площадь здания 800 кв.м, функциональное назначение объекта – комплекс по обслуживанию легкового и грузового автотранспорта (объект придорожного сервиса), состав объекта – ручная автомойка на 3 поста для легковых автомобилей, кафе-бар, магазин автозапчастей, СТО на 3 поста. Автостоянка на на 12 м/м (по расчету: гостевых — 5, для работающих – 2). На участке располагается портальная автомойка на 1 пост для грузового автотранспорта, очистные сооружения оборотного водоснабжения, мойка, очистные сооружения дорожного стока |

Сведения о наличии инженерных коммуникаций на указанных земельных участках и их характеристики содержатся на планово-картографических материалах в составе земельно-кадастровой документации. Инженерное развитие инфраструктуры застраиваемой территории участков осуществляется в соответствии с техническими условиями на инженерно-техническое обеспечение соответствующего объекта, выданными эксплуатирующими и согласующими организациями (согласно перечню, установленному Минским горисполкомом).

**Условия, предусмотренные в решениях Мингорисполкома в отношении всех земельных участков:**

проектирование вести в границах предоставленного земельного участка с учетом технических условий на инженерно-техническое обеспечение объекта и заключений согласующих организаций;

в месячный срок с даты государственной регистрации прав и ограничений (обременений) прав на предоставленный земельный участок приступить к разработке проектно-сметной документации;

не позднее 2 лет со дня утверждения акта выбора места размещения земельного участка для строительства объекта, разработать и утвердить в установленном порядке проектную документацию на строительство объекта в полном объеме;

обеспечить пользование предоставленным земельным участком в соответствии с целевым назначением и условиями его предоставления.

Аукцион состоится **24 августа 2015 г. в $16^{00}$ по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.**

Участниками аукциона могут быть граждане, юридические лица или индивидуальные предприниматели. В аукционе допускается участие на стороне покупателя консолидированных участников – двух и более граждан, индивидуальных предпринимателей, юридических лиц.

**Для участия в аукционе необходимо:**

**внести задаток (задатки) не позднее 18 августа 2015 г.** в вышеуказанном (графа 7 таблицы) размере (в случае участия в торгах в отношении нескольких земельных участков — задаток вносится для каждого из предметов аукциона), перечисляемый на расчетный счет № 3641000000016 в ОАО «АСБ Беларусбанк», код банка — 795, УНП – 100690830, назначение платежа – 04002, получатель – главное финансовое управление Мингорисполкома (задатки вносятся в белорусских рублях в суммах согласно настоящему извещению);

**представить в УП «Минский городской центр недвижимости» — организатору аукциона следующие документы:**

заявление на участие в аукционе;

документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков), с отметкой банка;

подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы, включающее обязательство по уплате в соответствии с законодательством штрафных санкций и иные требования;

**дополнительно представляются:**

гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования;

индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии устава и свидетельства о государственной регистрации юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

консолидированными участниками для участия в аукционе представляются также оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Прием документов, консультации по вопросам участия в аукционе и ознакомление с имеющейся документацией осуществляются по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. № 6, с 27 июля 2015 г. по 18 августа 2015 г. включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 18.00 (по пятницам до 16.45).

Торги в отношении каждого земельного участка проводятся при условии наличия не менее двух участников. Победителем торгов по каждому предмету аукциона признается участник, предложивший наиболее высокую цену.

Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на приобретение прав на земельный участок по начальной цене предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов, как единственный, подавший заявление на участие в аукционе, в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся, до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка обязан:

- внести плату за предмет аукциона (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения);
- возместить Минскому горисполкому расходы по подготовке документации для проведения аукциона;
- выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона;
- возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в т.ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. **Информация о данных затратах, порядке их возмещения доводится до сведения участников аукциона до его начала при заключительной регистрации под роспись и оплачивается по предоставляемому организатором аукциона счету-фактуре.**

После совершения названных действий, но не позднее 2 рабочих дней, Минский горисполком на основании решения об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона и протокола о результатах аукциона либо протокола о признании аукциона несостоявшимся, заключает с победителем аукциона либо единственным участником несостоявшегося аукциона договор аренды земельного участка сроком на 5 лет.

Оплата стоимости предметов аукциона осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли. По заявлению победителя аукциона Минский горисполком предоставляет рассрочку внесения платы за предмет аукциона. Указанное заявление подается победителем аукциона в Минский горисполком не позднее одного рабочего дня после утверждения протокола о результатах аукциона.

Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона (юридическое лицо, индивидуальный предприниматель в предусмотренных законодательством случаях в течение 6 месяцев, а гражданин в течение 1 года со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство объекта) должен приступить к занятию земельного участка (начать строительство – осуществление строительно-монтажных работ в соответствии с утвержденной проектной документацией) в соответствии с целью и условиями его предоставления. В случае невыполнения данного требования право пользования (аренды) земельного участка прекращается в установленном порядке.

До истечения срока аренды земельного участка (5 лет) лицо, которому он предоставлен по результатам аукциона, в установленном порядке и сроки обращается в адрес Минского горисполкома с заявлением о продлении срока аренды соответствующего участка (заключении нового договора аренды), на основании которого по решению исполкома ему предоставляется земельный участок в аренду на указанный в заявлении срок, но не более чем на 99 лет, при условии внесения этим лицом платы за право аренды земельного участка, рассчитанной на основании его кадастровой стоимости с применением коэффициентов, установленных Советом Министров Республики Беларусь исходя из сроков аренды земельных участков.

Всем желающим предоставляется возможность ознакомления с землеустроительной и градостроительной документацией по соответствующим земельным участкам (в том числе с характеристиками расположенных на земельных участках инженерных коммуникаций и сооружений (при их наличии) и условиями инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории). Осмотр земельных участков на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время.

**Контактный телефон: + 375 (17) 226-16-72, официальный сайт организатора аукциона: www.mgcn.by.**

# ИЗВЕЩЕНИЕ

## о проведении аукциона по продаже в частную собственность земельного участка для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома в Бобруйском районе

| Номер лота по порядку | Местоположение земельного участка | Начальная цена (руб.) | Размер задатка (руб.) | Расходы, связанные с подготовкой аукциона и документации, необходимой для его проведения | Условие проведение аукциона | Характеристика земельного участка | Кадастровый номер | Инженерная и транспортная инфраструктура | Дата проведения аукциона | Последний день приема заявлений |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1. | Бобруйский район, Сычковский сельисполком, д. Сычково, пер. Застройки-2, 2 | 7 202 258 | 720 226 | 14 327 136 (+ расходы за рекламу) (расходы возмещает победитель аукциона) | Наличие не менее двух участников | Площадь 0,1433 га | 720884009601000425 | - | 24.08.2015 г. | 18.08.2015 г. до 17.00 |

**ПРИМЕЧАНИЕ:** Аукцион состоится в 15.30 по адресу: **г. Бобруйск, ул. Пушкина, 215-а, 2-й этаж, малый зал заседаний.** Заявления принимаются по адресу: **г. Бобруйск, ул. Пушкина, 215-а, каб. 61, в рабочие дни с 08.00 до 17.00 с 1-го дня после публикации извещения в СМИ.** Информация о земельных участках по контактным телефонам в г. Бобруйске 72-05-40, 71-74-30.

Для участия в аукционе гражданин Республики Беларусь (лично или через своего представителя) в установленный в извещении о проведении аукциона срок обязан предоставить следующие документы в комиссию по проведению аукционов:

- заявление на участие в аукционе (с указанием кадастрового номера и адреса земельного участка);
- заверенную копию платежного поручения о внесении задатка (10 % от начальной цены) на расчетный счет Сычковского сельисполкома №3600712110013 в АСБ «Беларусбанк», филиал 703, код 760, УНН 700045734, код платежа 04901;
- представителем гражданина Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность;
- при подаче документов на участие в аукционе граждане предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Порядок проведения аукциона:

1. К участию в аукционе допускаются лица, подавшие в указанные в извещении сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении расчетный счет задаток.

2. Первая объявленная аукционистом цена предмета аукциона определяется в соответствии с шагом аукциона. Торги продолжаются до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер поднял только один участник аукциона. Аукционист называет последнюю цену и номер данного участника трижды и объявляет проданным предмет аукциона словом «продано», а участника аукциона – победителем в отношении соответствующего предмета аукциона.

3. При отсутствии лиц из участников аукциона, готовых выкупить предмет аукциона по названной цене, аукционист называет эту цену три раза. Аукцион завершается, если после трехкратного объявления новой цены предмета аукциона ни один из участников аукциона не поднял своего номера.

4. Предмет аукциона снимается с аукциона по решению комиссии или организации до начала проведения аукциона в случае отсутствия участников аукциона либо если на объект аукциона претендует только один гражданин.

В течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона победитель аукциона обязан внести плату за земельный участок, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, и выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, которые подлежат выполнению до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка.

Всем желающим предоставляется возможность предварительного ознакомления с объектом.

В суд Кобринского района поступило заявление о признании безвестно отсутствующей гражданки Майзус Эльвиры Юрьевны, 06.01.1954 года рождения, уроженки г. Ярославля Российской Федерации, последнее известное место жительства — Республика Беларусь, Брестская область, г. Кобрин, ул. Советская, д. 129, кв. 19.

Просьба ко всем гражданам и юридическим лицам сообщить в суд Кобринского района Брестской области имеющиеся сведения о Майзус Эльвире Юрьевне в течение 2 месяцев с момента публикации.

ОАО «Современные розничные технологии» уведомляет, что в публикации газеты «Звязда» №138 (27996) от 23.07.2015 г. дату проведения собрания акционеров «23 июля 2015» читать как «03 августа 2015».
УНП 690019195

# РАЯЛЬ НА ВЫНАС,

## або Што турысты цягнуць з гасцініц

**Нядаўняе міжнароднае апытанне амаль пяці тысяч турыстаў паказала, што больш за ўсё схільныя да крадзяжу ў гатэлях госці з Аргенціны, ЗША, Сінгапура і Іспаніі. СМІ вырашылі высветліць, якія найбольш экстравагантныя крадзяжы здзяйснялі ў вандроўцы. Пагадзіцеся, дзіўна, калі з гасцініцы знікае, напрыклад, ручнік або чайнік. Але і не такое, аказваецца, бывае!**



### МЕЛАМАНЫ

Колін Бенет, былы генеральны менеджар Starwood Hotel Group, успамінае самы нахабны крадзеж, з якім ён сутыкнуўся за 20 гадоў вядзення турыстычнага бізнесу. «Як толькі я ўвайшоў у вестыбюль аднаго гатэля, — распавядае ён, — я адразу зразумеў, што чагосьці не хапае. Высветлілася, што тры чалавекі, якія прагульваліся побач з рэсэпшнам, вывезлі адсюль раяль і пакацілі ўніз па вуліцы. Больш не бачылі ні іх, ні раяля». У кустах, мабыць, схавалі...

### ДОМА ЛЕПШ

Бенет таксама адзначыў незлічоную колькасць выкрадзеных тэлевізараў і праектараў. «Праглядаючы запісы з камер відэаназірання, мы часам бачым, як міма занятых супрацоўнікаў рэсэпшна ціхенька праходзяць госці, згінаючыся пад цяжарам тэлевізара. Паводзяць сябе, як быццам так і трэба», — дзівіцца ён.

### БУДЗЕ МОЙ

У гатэлі du Vin у Бірмінгеме затрымалі эмацыйнага госця, які спрабаваў выкрасці галаву дзіка з більярднай. Праз некалькі тыдняў сябры прысаромленага злодзея з'явіліся ў гатэль і заплацілі за гэтае чучала, каб падарыць яго сябру на вяселле.

### НА ПАМЯЦЬ

У Franklin Hotel у Найтсбрыджы адзін з пастаяльцаў адкруціў з дзвярэй таблічку з нумарам свайго пакоя. «Мы заўважылі прапажу толькі тады, калі сустрэлі ні ў чым не вінаватага госця, які жыве ў гэтым нумары — ён бадзяўся па калідоры ў пошуках сваіх апартаментаў», — распавёў генеральны менеджар гатэля.

### БО НЕ ПРЫБІТЫЯ

Пазбаўлены прэтэнзіі на гламур гатэль Travelodge, дзе тэлевізары і фены часцяком прыбітыя да сцяны дзеля захаванасці, таксама не застрахаваны ад клептаманіі. З гатэля, небагатага на празмернасці, госці з'язджалі з дыванамі, свяцільнямі, люстэркамі і нават шторамі (увогуле, усім тым, што гатэльерам не ўдалося прыкруціць і прыбіць намертва).

### КВЕТКІ ДЛЯ КАХАНАЙ

У Sheraton Park Tower менеджарам кожны тыдзень даводзіцца марнаваць шмат грошай на свежыя кветкі, каб замяніць тыя, якія знікаюць без вестак. Рамантычныя пастаяльцы пастаянна забіраюць іх дадому.

### ПАЗЫЧЫМ ГАДАВАНЦА

Быў у гісторыі індустрыі гасціннасці і інцыдэнт, калі скралі сабаку гаспадара гатэля.

### ЗНАТАКІ

Гісторыя таксама ведае выпадкі крадзяжоў з гасцініц па-сапраўднаму каштоўных твораў мастацтва. У гатэлі W у Ганконгу аднойчы хапіліся вядомай працы Эндзі Уорхала коштам 300 тысяч долараў.

### КАМІН, СЭР

Зладзеі па той бок Атлантычнага акіяна таксама вельмі дзёрзкія. Адзін джэнтльмен падчас знаходжання ў славутым галівудскім гатэлі Four Seasons Beverly Wilshir, які фігураваў у фільме «Красуня», скраў мармуровы камін. І як толькі выцягнуў?..

### ТАРЫФ «БЯРУ ЎСЁ»

І, нарэшце, мабыць, самы нахабны крадзеж, нават рабаванне. Пара, якая спынілася ў амерыканскім Holiday Inn, спецыяльна папрасіла нумар каля аўтастаянкі. Затым саўдзельнікі спустошылі ўвесь прадастаўлены пакой (вынеслі ложак і мноства іншай мэблі), пагрузілі ўсё на прыпаркаваны побач грузавік і з'ехалі ў невядомым кірунку.

### САМЫ ПАПУЛЯРНЫ ЗНАК

У Нарвегіі, па звестках аўтадарожнага ведамства, штогод знікае каля 500 знакаў з выявай лася ў чырвоным трохвугольніку. Турыстам так падабаюцца гэтыя дарожныя знакі, што сувеніры-налепкі з выявай сахатага, якія іх імітуюць, не каціруюцца.

### ВЕЧНАСЦЬ З САМАЗВАЛА

Шматлікія турысты, якія пабылі на руінах у Егіпце і Грэцыі, імкнуцца займець свой кавалачак вечнасці. Праўда, мала хто ведае, што да пірамід той жа Гізы раз у некалькі месяцаў падганяюць пару самазвалаў гравію, і раскідваюць яго якраз для турыстаў.

### Амерыканцы — горшыя

**Як паведамляе The Independent са спасылкай на даследаванне партала Travel Zoo, грамадзян ЗША прызналі самымі горшымі турыстамі. Адзначаецца, што ў апытанні, якое датычыцца шкодных звычак на адпачынку, прынялі ўдзел каля 9,5 тысячы чалавек з ЗША, Канады, Вялікабрытаніі, Германіі і Кітая. Па выніках даследавання высветлілася, што жыхары ЗША ўзначалілі рэйтынг тых, хто часцей за ўсё крадзе касметычныя сродкі і ручнікі з гатэляў. 64% амерыканцаў хоць бы раз спраўлялі патрэбу ў басейн, і, акрамя таго, амерыканцы прызналіся ў тым, што прыкідваюцца хворымі, каб падоўжыць свой адпачынак яшчэ на дзень.**

**Асноўнымі выкрадальнікамі гасцінічнай маёмасці сталі турысты з: 1. ЗША (69%), 2. Канады (61%), 3. Кітая (61%), 4. Вялікабрытаніі (45%), 5. Германіі (20%).**

**Часцей за ўсё выкрадаюць у гатэлях: ручнікі/пасцельную бялізну (68% выпадкаў), батарэйкі/лямпачкі (57%), ежу/напоі (51%), сталовыя прыборы (45%), рамкі для фота (36%), творы мастацтва (30%), шторы (27%), чайнікі (19%), кнігі (15%).**

## СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 5.10 | 21.24 | 16.14 |
| Віцебск — | 4.53 | 21.20 | 16.27 |
| Магілёў — | 4.59 | 21.12 | 16.13 |
| Гомель — | 5.04 | 21.02 | 15.58 |
| Гродна — | 5.27 | 21.37 | 16.10 |
| Брэст — | 5.35 | 21.30 | 15.55 |

### Месяц

*Першая квадра ў 6.03.*
*Месяц у сузор'і Скарпіёна.*

### Імяніны

***Пр.*** *Алены, Вольгі.*
***К.*** *Вольгі, Міхаліны, Хрысціны, Антона, Барыса.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЗАЎТРА




## Даты Падзеі Людзі

### 24 ЛІПЕНЯ

**1606** год — мястэчка Любча (сёння — гарадскі пасёлак у Навагрудскім раёне) стала ўладаннем князёў Радзівілаў, якія пабудавалі замак. Ён існуе і сёння). У 1590 годзе атрымала права на самакіраванне і свой першы герб — на блакітным полі сярэбраная падкова з трыма залатымі крыжамі; у сярэдзіне падковы дзве рыбіны. У 1644 годзе, дзякуючы новым уладальнікам мястэчка, Любча атрымала новы герб — на блакітным полі брама з дзвюма вежамі; паміж вежамі ўзброены рыцар, у правай руцэ якога меч, у левай — шчыт.

**1820** год — нарадзіўся (г. Пружаны) Люцыян Крашэўскі, беларускі мастак, фатограф. Скончыў Свіслацкую гімназію, Дэрпцкі ўніверсітэт. Жыў у радавым маёнтку каля Пружанаў. У 1857 годзе наведаў мастацкія галерэі ў Бельгіі, Галандыі і Германіі. Удзельнік паўстання 1863—1864 гадоў. За дапамогу ўдзельнікам паўстання сасланы ў Пермскую губерню. Пасля заканчэння высылкі пасяліўся ў Варшаве. Ілюстраваў творы свайго брата Ю. Крашэўскага. Адлюстроўваў асаблівасці жыцця Польшчы, Беларусі і Літвы напярэдадні паўстання. Стаў адным з першых польскіх фатографаў і фотарэпарцёраў. Памёр у 1892 годзе.

**1945** год — на Патсдамскай (Берлінскай) канферэнцыі кіраўнікоў дзяржаў — пераможцаў у Другой сусветнай вайне (СССР, ЗША і Вялікабрытаніі), пры абмеркаванні пасляваеннага ўладкавання, амерыканскі прэзідэнт Гары Трумэн апавясціў Іосіфа Сталіна аб тым, што ў ЗША створана «зброя жахлівай разбуральнай сілы» , пры гэтым ён не ўдакладніў, што гаворка ідзе пра атамную бомбу, якая была ўпершыню выпрабавана тыднем раней. Да здзіўлення Трумэна і брытанскага прэм'ера Чэрчыля савецкі правадыр, які даўно ведаў пра амерыканскі ядзерны («манхэтэнскі») праект і які знаходзіўся ў курсе аналагічных работ англійскіх вучоных, і «брывом не павёў». Саюзнікі СССР па вайне з гітлераўскай Германіяй не ведалі, што савецкая разведка рэгулярна паведамляла кіраўніцтву аб англа-амерыканскіх атамных распрацоўках. Яе агенты працавалі і ў групе «манхэтэнскага» праекта, і ў брытанскіх спецслужбах. А ў СССР група фізікаў на чале з акадэмікам Курчатавым працавала над стварэннем атамнай зброі яшчэ з 1943 года. Аб сапраўды жахлівай сіле ядзернай зброі сусветная грамадскасць даведалася 6 і 9 жніўня 1945 года пасля амерыканскіх бамбаванняў японскіх гарадоў Хірасімы і Нагасакі, дзе загінулі сотні тысяч мірных жыхароў. Сёння агульнавядома, што раней амерыканскія ВПС «шкадавалі» гэтыя гарады. Бо абедзве густанаселеныя «цэлі», у асноўным з драўляных пабудоў, найлепшым чынам падыходзілі для ўсебаковага вывучэння эфектыўнасці новых бомбаў. Ацэньваючы вынікі гэтых варварскіх «эксперыментаў», прэзідэнт Трумэн напісаў: «У самай буйной у гісторыі азартнай навуковай гульні мы паставілі на карту два мільярды долараў і выйгралі(!)».



### Было сказана

**Еўдакія ЛОСЬ, паэтэса:**

*«Злосныя радкі шануюць крытыкі,*
*добрыя радкі беражэ народ».*

## УСМІХНЕМСЯ

**— Дарагі, я сёння ўся на нервах, не пытайся чаму.**
**— Добра.**
**— Вось табе заўсёды было ўсё роўна!**

Хадзіў з дзяўчынкай у адзін садок — у адну групу, у школе — у адзін клас, у каледжы — у адну групу. У «Аднакласніках» гляджу — ёй 27 гадоў, а мне 38.

**— Вовачка! Ты чаму ўчора не быў у школе?**
**— А я падарунак настаўніцы рабіў.**
**— Які падарунак?..**
**— А ў яе ўчора быў дзень нараджэння. Вось я і вырашыў — хай адпачне без мяне.**

Учора зрабіла сабе маску з сіняй гліны, намазала ёй амаль усё цела, дык мой увесь вечар за мной бегаў і крычаў, што ён хоча секса з баклажанам. Дурань...

**Жанчына скардзіцца сяброўцы: «Муж з сынам з'ехалі на тыдзень на рыбалку. Дзень адна ў кватэры, другі... На трэці пачалася ломка — карміць няма каго!»**

Жаночая суперздольнасць № 1077:
— Дарагая, гэта чорны?
— Гэта СІНЯВАТА-АБСІДЫЯНАВЫ!
— А гэта бардовы?
— Гэта ДАРК ЧЭРЫ, ты сляпы ці што?!




caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, 287 17 21, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.890. Індэкс 63850. Зак. № 2866.

Нумар падпісаны ў 19.30 23 ліпеня 2015 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12